

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

За слова «сволочь» у адрас Караева жыхару Баранавічаў прысудзілі 2 гады «хіміі»

Жыхара Баранавічаў **Андрэя Званарова** абвінавацілі ў тым, што ён 28 кастрычніка 2020 года ў тэлеграм-канале «Бараўкі Свабодныя» пад фотаздымкам былога міністра ўнутранных спраў Юрыя Караева наўмысна змясціў абразлівы каментар — напісаў слова «сволочь».

Андрэй Званароў віну прызнаў цалкам, патлумачыў, што састаяў у тэлеграм-чаце, заклікаў выключна да мірнага вырашэння накіпелых праблемаў у грамадстве, ніколі не заклікаў да агрэсіі, а калі іншыя людзі выказвалі нешта негатыўнае ў дачыненні да прадстаўнікоў закона, ён ніколі іх не падтрымліваў. Аднак, калі была апублікаваная інфармацыя, дзе Караеў заклікаў бяздумна выкарыстоўваць баявую зброю, Андрэй абурыўся:

«Па мойму меркаванню, гэта разыходзіцца як з нормамі закона, так і з чалавечымі маральнымі [каштоўнасцямі]. І тым больш сітуацыя на той момант была дастаткова напруджаная».

Ён на эмоцыях выказаў сваё стаўленне — напісаў слова «сволочь». Калі размяшчаў каментар не меў намеру нікога канкрэтна абразіць, а проста хацеў выказаць свае адносіны да напісанага ў публікацыі.

Пракурор **Іван Гаўдзей** прасіў суд прызнаць Андрэя вінаватым і пакараць яго двума гадамі «хіміі», а тэлефон мужчыны, праз які ён пакінуў каментар, канфіскаваць у даход дзяржавы як сродак здзяйснення злачынства.

Суддзя **Іна Паўлоўская** пагадзілася з прапановай пракурора і **прызначыла абвінавачанаму два гады «хіміі»**.

t.me/viasna96/6909

6.8K viewsedited Aug 31, 2021 at 20:49

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy